супрацоўніцтва з разнастайнымі грамадскімі інстытутамі, навуковымі установамі і інш. Так Мінскі РАА заключыў Пагадненне аб супрацоўніцтве і распрацоўцы сумесна з аддзелам культуры Мінскага райвыканкама комплексна-мэтавай праграмы дзейнасці па эстэтычнаму выхаванню навучэнцаў.

Падобны вопыт існуе ў Салігорскім ГАА, СШ № 24 г. Барысава, СШ № 9 г. Жодзіна, Краснадворскай СШ Салігорскага раёна, Сенніцкай СШ Мінскага раёна, СШ № 5, 9 г. Салігорска, Метчанскай СШ Барысаўскага раёна і г.д.

Навуковую і метадычную дапамогу педагагічнаму калектыву аказвае абласны інстытут павышэння кваліфікацыі кадраў адукацыі.

Супрацоўнікамі распрацавана канцэпцыя эстэтычнага выхавання і развіцця школьнікаў. На яе падставе могуць быць створаны розныя мадэлі выхаваўчых сістэм у адукацыйных установах вобласці. У цяперашні час творчае выкарыстанне канцэпцыі забяспечыла комплексна-мэтавая Праграма эстэтычнага выхавання школьнікаў Мінскага раёна, Уздзенскага раёна; Праграма эстэтычнага выхавання ў СШ № 2, 7; гімназіі № 3 г. Барысава; у Дружненскай СШ Пухавіцкага раёна; Новадворскай СШ Мінскага раёна і інш.

*М.Ул. Грудзінскі, Т.В. Паздзеева*
(г. Мінск)

## СЕЛЬСКАЯ ШКОЛА: КРОКІ РЭФОРМЫ

Дубінскую базавую школу-дзіцячы сад, размешчаную на тэрыторыі калгаса «Зара» Валожынскага раёна, узначальвае педагог-энтузіяст Ала Віктараўна Клімкова. Шмат спецыфічных цяжкасцей даводзіцца пераадольваць ёй і невялікаму педкалектыву ў арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу, каб падтрымліваць яго на ўзроўні патрабаванняў рэфармацыйнага часу. Асноўныя з іх: аддаленасць школы ад навукова-метадычных і культурных цэнтраў, недасканаласць навучальных праграм і падручнікаў, малакольkасны вучнёўскі кантынгент, звужанае кола зносін вучняў у геаграфічна-сацыяльным ракурсе, абмежаванае моўнае асяроддзе, характэрная раз'яднанасць вучняў з-за аддаленасці населеных пунктаў адзін ад аднаго і г.д.

І тым не менш педкалектыў навучальнай установы пад кіраўніцтвам свайго няўрымслівага важака дасягнуў надзвычайных поспехаў у рэфармаванні навучальна-выхаваўчага працэсу, аб чым расказвалася ў раённай газеце «Працоўная слава» і абласной – «Мінская праўда». Мы не будзем паўтараць змест іх публікацый, але паведамім у падтрымку сваіх слоў

наступныя факты: у мінулым навучальным годзе школа стала пераможцай раённага трохдзённага турыстычнага злёту, раённага конкурсу на лепшы турыстычны паход з афармленнем матэрыялаў на адпаведны абласны конкурс. На базе школы праводзіліся метадычныя заняткі намеснікаў дырэктараў па навучальна-выхаваўчай рабоце і настаўнікаў рускай мовы і літаратуры школ раёна. Пагадзіцеся, гэта і адказна, і ганарова.

Галоўная, бадай, мэта школьнай рэформы на сучасным этапе – пераключэнне ўвагі педкалектыву на асобу вучня і праблемы ў яе развіцці, забеспячэнне пераемнасці ў навучанні і выхаванні нашчадкаў. Што назіралася раней? Развітаўшыся з дзіцячым садам і пераступіўшы парог школы, першакласнік аказваўся ў даволі складаным псіхапагічным становішчы. Усё для яго было незнаёмае і нязвыклае: і новая дзіцячая суполка, і новыя патрабаванні, і новыя прадметы, і новыя выхавацелі ў асобе настаўнікаў... Аналагічныя праблемы паўставалі і перад педагогамі: учарашнія дзетсадаўцы ўяўлялі для іх, вобразна кажучы, чысты аркуш паперы.

Не дзіўна, што ў часткі вучняў маглі скласціся ў такой сітуацыі, асабліва пры наяўнасці абыякавасці да індывідуальнага «я» дзіцяці, негатыўныя адносіны да таго ці іншага настаўніка, а значыць – і да яго прадмета. З пераходам з класа ў клас такі «раскол» не заўсёды пераадольваўся, і ў выніку навучальны працэс страчваў для школьніка сваю жывую прыцягальнасць, а школа з аб'екта радасных адчуванняў ператваралася ў аб'ект смутку і вымушанага адбыцця часу. Будзем аб'ектыўнымі: такая з'ява была досыць распаўсюджанай у нашых школах. Педагогам яе ўдалося поўнасцю выключыць з педагагічнай практыкі. І менавіта – з дапамогай аб'яднання школы і дзіцячага сада.

Паколькі дзіцячы сад стаў неад'емным звяном школы, узнікла неабходнасць у ажыццяўленні аналітычных захадаў на стыку «выхаванец выпускной групы дзіцячага сада – першакласнік школы». Асноўная іх мэта – складанне псіхолага-педагагічнай характарыстыкі падапечных дзяцей, у сумесным афармленні якой уздзельнічаюць выхавацель дзетсада і настаўнік 4-га класа школы. Іх назіранні і вывады абагульняюцца на штогадовым педагагічным кансіліуме, які праводзіцца ў першым паўгоддзі.У выніку настаўнік пачатковых класаў стрымлівае разгорнутую «візітную картку» малодшага школьніка. Акалічнасць вельмі важная.

Якія элементы асобы «адлюстроўваюцца ў псіхолага-педагагічнай характарыстыцы? Праяўленні лідэрскай пазіцыі, цікавасць да тых ці іншых заняткаў і прадм. аў, здольнасць да наладжвання і падтрымання сяброўскіх адносін з равеснікамі і г.д. Карыснымі для карэкціроўкі педагагічна-навучальнага працэсу з'яўляюцца традыцыйныя агляды ведаў навыкаў

трэцякласнікі – аплікацыяй. У дадзеным выпадку навучальны працэс цесна ўвязваецца з духоўным выхаваннем дзяцей.

У праграме рэформы агульнаадукацыйнай школы падкрэсліваецца: рэформа павінна мець ярка выражаны асобасны гуманістычны характар – гэта значыць, не проста ўзбройваць вучняў пэўнай сумай ведаў па вучэбных дысцыплінах, а ўсяляк садзейнічаць усебаковаму развіццю асобы школьніка. Бясспрэчна, выхаванне грамадзянскасці тут стаіць на адным з першых месцаў. Педагогі зыходзяць з таго, што будучыя грамадзяне Айчыны павінны быць здаровымі, фізічна моцнымі, духоўна развітымі, добра ведаць спадчынныя карані сваіх продкаў, валодаць якасцямі міласэрнасці і патрыятызму, праяўляць заўсёдную гатоўнасць да барацьбы з ганебнымі з'явамі ў нашым жыцці.

Сёння без перабольшання можна сказаць, што ў школе склалася выразная сістэма фарміравання ў дзяцей, прамым ці ўскосным шляхам, пералічаных якасцей. У Дубіне акть ўна працуюць мэтавыя гурткі «Юны мастак», «Умелыя рукі», «Юная швачка», спартыуны, танцавальны, вакальны і іншыя, у якіх дзеці не толькі развіваюць свае мастацкія густы, але і вучацца сумленным адносінам да працы. Пры гэтым вучань мае магчымасць скарэкціраваць, як кажуць, па ходу справы профіль сваіх захапленняў, а пры жаданні – займацца ў некалькіх гуртках. Вельмі важна забяспечыць аптымальны рэжым дзейнасці гурткоўцаў – зацікаўленую занятасць іх на працягу ўсяго адведзенага часу.

Магчыма, хтосьці здзівіцца: такая маленькая школа, а столькі гурткоў працуе! Каб развеяць сумненні, можна пабываць на творчых справаздачах-выстаўках нашых вучняў «Плён маёй фантазіі», на іх канцэртах «Спыняцца зямныя крокі, а песні ў вечнасці жывуць», якія зрабіліся традыцыйнымі. Ці на школьных спартакіядах у пачатку навучальнага года, сваце здароўя і спорту – на яго фінішы. Набытыя ў час гуртовых заняткаў, навыкі і веды пераканаўча рэалізуюцца ў такіх масавых мерапрыемствах, паглядзець на якія ахвотна збіраюцца бацькі дзяцей, аднавяскоўцы, а іншы раз і заезджыя госці.

Выхаванне дзяцей на традыцыях продкаў, па гісторыка-краязнаўчым матэрыяле з'яўляецца адным з важнейшых напрамкаў выхаваўчай работы ўвогуле. Вялікай папулярнасцю ў навучэнцаў Дубінской школы-сад карыстаюцца святы народнага каляндара – «Каляды», «Вялікдзень», «Масленіца», да якіх з захапленнем рыхтуюцца і выхаванцы дзетсада, і школьнікі, і настаўнікі, і бацькоўская грамадскасць. Дзеці грунтоўна знаёмяцца з народнымі традыцыямі, завучваюць прыпеўкі-ушанаванні, прысвечаныя руплівым гаспадарам, аднаўляюць гульні і жарты, у якіх адлюстраваны жывы розум, вясёлы нораў, мудры аптымізм продкаў. У

пераліку такіх мерапрыемстваў асаблівае месца займае «Дзень гумару», які дазваляе вучням праявіць сваю творчую знаходлівасць.

Фарміруючы і замацоўваючы ў свядомасці дзяцей такія адметныя рысы чалавека-грамадзяніна, як любоў да сваёй Бацькаўшчыны, павага да яе сівой даўніны і баявой славы, да старых людзей, педагогі імкнуцца да таго, каб дзеці самастойна, праз свае ўчынкі і дзеянні, уносілі ў гэты складаны працэс жывыя элементы адухоўленасці. У школе створаны і актыўна дзейнічаюць дзве вучнёўскія арганізацыі: «Заранка» (першыя-чацвертыя класы) і «Дабрадзеі» (пятыя-дзевятыя класы). У кожнай з іх – свае законы, свой дэвіз, дакладна акрэсленыя напрамкі дзейнасці, свае камандзіры, абраныя з ліку вучняў. Члены «Заранкі», напрыклад, шэфствуюць над выхаванцамі дзіцячага сада.

На дзейнасці «Дабрадзеяў» хочацца спыніцца больш падрабязна. З улікам таго, што ў мікрараёне школы пражываюць 18 адзінокіх састарэлых людзей, 15 інвалідаў, ветэранаў вайны і працы, гэта арганізацыя стварыла са сваіх членаў спецыяльны «Атрад міласэрнасці». Камусьці са старых неабходна прынесці вады, пакалоць дроў ці прыбраць у хаце, камусьці – скасіць траву на двары, сабраць яблыкі ў садзе ці адрамантаваць плот – усё гэта па ўласнай ініцыятыве зробяць вучні-байцы «Атрада міласэрнасці». Ні адзін з 33 іх падапечных не застаўся па-за ўвагай вучняў. Добрай традыцыяй «Дабрадзеяў» стаў працоўны дэсант «Мая вуліца» – па добраўпарадкаванню і азеляненню вясковых вуліц.

Школьныя турысты неаднаразова станавіліся прызёрамі і пераможцамі розных спаборніцтваў і конкурсаў-аглядаў. Тут у педагогаў захоўваецца дыферэнцыраваны падыход. Скажам, юныя энтузіясты турысцкай справы з першых–чацвёртых класаў аб'ядноўваюцца ў атрадзе «Шукальнікі». Яны займаюцца збіраннем мясцовых матэрыялаў вуснай народнай творчасці (легенды, казкі, песні, прымаўкі, абрады). Вучні пятых–шостых класаў стварылі атрад «Нашчадкі» і выконваюць адказнае заданне: афармляюць альбом «Знакамітыя людзі, якія закончылі нашу школу». Вучні з сёмых–дзевятых класаў увайшлі ў атрад «Следапыты». Іх ганаровая «місія» – удзел у раённых мерапрыемствах (у прыватнасці, у конкурсе творчых работ навучэнцаў сельскіх школ «Летапісанне роднай вёскі»), аказанне адпаведнай дапамогі малодшым школьнікам.

Азнаямленне дзяцей з гістарычнай і культурнай спадчынай народа, далучэнне іх да актыўнай турысцка-краязнаўчай дзейнасці – гэта не толькі гуртковая работа па індывідуальных інтарэсах вучняў з мэтай выхавання грамадзянскасці. Гэта і ўзбраенне школьнікаў канкрэтнымі жыццёвымі ведамі па многіх дысцыплінах навучальнай праграмы – ведамі, якія далёка не заўсёды знойдзеш у школьных падручніках. Нарэшце, гэта – выдатныя

практычныя стымулы да прыняцця вучнямі самастойных рашэнняў, развіцця і фарміравання іх мысліцельных навыкаў. Не памерамі навучальнай установы абумоўліваюцца пазітыўныя зрухі ў рэфармаванні школьнай справы. Іх найпершая гарантыя – мэтанакіраванасць педкалектыву.

***Д.Н. Фещенко***
**(г. Березино)**

## ФОРМЫ МЕТОДИЧЕСКОЙ РАБОТЫ С ПЕДАГОГИЧЕСКИМИ КАДРАМИ В БЕРЕЗИНСКОЙ ШКОЛЕ-ИНТЕРНАТЕ

Педагогический коллектив школы в текущем учебном году работает над проблемой « Выявление и включение в педагогический процесс основных системообразующих факторов саморазвития и самореализации личности ученика» и ставит перед собой задачи:

1. Развитие активности, самостоятельности, ответственности в педагогическом процессе на основе деятельного подхода.

2. Работа педколлектива по предупреждению детской преступности путем психологизации учебно-воспитательного процесса.

3. Выполнение закона РБ «О правах ребенка» создание условий по охране жизни и здоровья детей.

Воспитанники школы – дети из тяжелых семей. Большой процент детей с нейропсихическими нарушениями, грубой депрессией. Познавательные способности учащихся развиты очень слабо.

В течение года учащиеся изучаются учителем – дефектологом и педагогом – психологом. Результатом этого является составление медико-психологических характеристик. На детей собирается банк данных.

Работа, которая проводится этими педагогами направлена не только на исправление дефектов в речевом развитии, корректируя все психические процессы, но и на решение задачи: развитие личности ребенка и его способности самостоятельно учиться. Психолог школы составляет индивидуальные карты развития каждого ребенка по классам.

В этом учебном году спланировано проведение тематических педсоветов:

1. Деятельность педколлектива по реализации в учебном процессе концепции личностно-ориентированного обучения.

2. Задачи педколлектива школы по использованию разнообразных форм оценки результатов деятельности учащихся.

3. О работе педколлектива по реализации свободы выбора в процессе обучения и воспитания.